Валянцін Бойка



...чым больш эфемерная пабудова,

тым цяжэй яе разбурыць...

# Тупая брама

***Эсэ***

Люблю перачытваць класіку. Усё адно як слухаць старую кружэлку, калі ўжо ведаеш на памяць кожны акорд. Штоpазу з падсьвядомасьці выплываюць новыя думкі. Багдановічаву «Пагоню» я ўпадабаў яшчэ ў школе. Праблемы беларушчыны тады цікавілі мяне гэтаксама, як выпускніцу балетнае школы пытаньні квантавай фізікі. Аднак на тле невычэрпных фантанаў сьлёз па гаротнай долі беларускага народу тая моц, якой проста праменіўся кожны радок, міжволі выклікала павагу. Замест лапцюж-нае Беларусі, што замілавана нюхае старыя анучы, у абліч-чы ваяроў паўставала Беларусь змагарная, закутае ў жале-за. Цягам дзесяцігодзьдзяў вершнікі вандруюць са збор-ніка ў зборнік, звычайна мінаючы цэнзурныя перашкоды. І я быў дужа ўсьцешаны, калі пабачыў у сучаснай, дых-тоўна выдадзенай дзіцячай кніжцы знаёмыя радкі:

...Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –

Ўспомню Вострую Браму сьвятую...

Радасьць была нядоўгай. Неўзабаве яна зьмянілася лёгкім подзівам, які ў сваю чаргу перайшоў у абурэньне: верш абрываўся яшчэ на трэцім радку. Няўжо «ваякі на грозных канях» дзесьці заблукалі, або засядзеліся ў прыдарожнай карчме, так і не даехаўшы да чытача? Мабыць, пільныя рэдактары пабаяліся незнарок пасеяць атрутнае семя нацыяналізму ў дзіця-чых душах. Таму й учынілі над вершам ідэалагічную кастрацыю. Цэн-зарскім нажніцам абы толькі рэзаць: хоць радкі класікаў, хоць патэнцый-ную туалетную паперу.

Даўно сышло ў нябыт Вялікае Княства Літоўскае. Туды ж пакацілася й Вялікае Княства Савецкае. Застаецца толькі тужліва пазіраць праз мяжу на адвечны сімвал сьветлых спадзеваў і няспраўджаных мараў – Вострую Браму. Яна страчаная для нас, бадай, назаўсёды. Але ў прыродзе, як вядома, нішто не зьнікае бяз сьледу – дзейнічае закон захаваньня рэчыва. На месца Вострай Брамы, схаванай за паласатай лапай шлагбаўму, нязграбнай калгаснай цёткай важка ўзгрувасьцілася яна – Брама Тупая.

...Над расьпешчанай веснавым сонцам зямлёю бадзяўся гарэзны вят-рыска. Яму было няўцям, навошта купка маладзёнаў гойсае па старым стадыёне, замест таго, каб ціхамірна шпацыраваць па ачмурэлых ад даўга-чаканага цяпла вуліцах. Краіне патрэбныя здаровыя адмыслоўцы. Таму ў нас ідуць заняткі фізічнага выхаваньня. Язык бездапаможна павісае на плячы ўжо на пятнаццатай хвіліне шалёнага бегу. Хочацца зьнясілена прылегчы на смарагдавы газон, летуценна ўзьняць вочы да неба й ціха сканаць. Нерухомае цела будзе адпачываць пад белай сьцяною, маляўніча раскінуўшы рукі. Надпіс «Да здравствует советский спорт!» арганічна дапаўняе пейзаж. Я быў блізкі да ажыцьцяўленьня свайго маладушнага намеру, калі раптам спыніўся, бы выцяты перуном: пры ўваходзе на стадыён, шырока растапырыўшы ногі-калоны, у мой бок пазірала яна – Тупая Брама. Дакладней, яе матэрыяльнае ўвасабленьне. Каменная спаруда цнатліва-блакітнага колеру, аскепак эпохі замшэлага сталінізму. Чамусь раней я не заўважаў, што апрача ўсяго іншага, яна абсалютна тупая ўверсе. Пражэрлівы шашаль часу баіцца толькі пірамідаў і няўмольна падточвае ўсё астатняе, што трапляе пад ягоныя магутныя сківіцы. Але толькі не Тупую Браму. Паўсталая на хісткім грунце людское сьвядомасьці яна аказалася надзвычай трывалаю. Парадокс: чым больш эфемерная пабудова, тым цяжэй яе разбурыць. Як зьнішчыць тое, чаго насамрэч няма? Гэтак жа пасьпяхова можна ваяваць з ранішнім туманам. Тупая Брама – гэта ня проста спаруда, што прытулілася на мазырскім стадыёне. Гэта неадчэпны відзеж, які ўпарта перасьледуе кожнага хворага на Беларушчыну. Ён мае звычку паўставаць аднекуль з-пад зямлі ў самы непрыдатны момант. Тупая Брама – зьява нематэрыяльная, але нярэдка спрычыняецца да цалкам матэрыяльных гузакоў (часам даволі балючых). На яе штодня натыкаешся, калі імкнешся чарговы раз давесьці абэцэдарскія ісьціны. Не разумеюць. Хаць кол на галаве чашы. Звонкія словы на друзачкі разьбіваюцца аб драўляныя позіркі. Так і скача на языку зусім не паэтычны эпітэт: «тупыя».

– Як можна чагось дамагчыся з *такім* народам?! – рытарычнае пытаньне стала амаль такой жа абэцэдарскай ісьцінай, як і тая, што трэба размаўляць сваёй моваю. Народ можа і ня надта кемлівы. Але біцца ілбом у адзін і той жа дуб з упартасьцю дзятла, ды яшчэ з разгону, – таксама ня ёсьць прыметай вялікага розуму. Зрэшты, менавіта гэта хочацца рабіць, пабачыўшы на вуліцах роднага Мазыра шыльду «Сузорье» альбо

«Криничка». Вясёлае сьвята маразму. А гарадзкія пошты, якія гандлююць цыбуляй, – проста кантрольны стрэл у галаву.

– Так жыць нельга! – ашалелыя вочы сьвідруюць хмары. Пярун не абудзіўся ад сну, раскалоўшы аблокі агнём праведнага гневу. Нябёсы рэагуюць на мой нацыянальна сьвядомы лямант даволі абыякава. Пачынае церушыць калючы, драбнюткі дождж. Туманнае мроіва, калыхаючыся ў золкім паветры, пакрысе гусьцее, набываючы абрысы Тупой Брамы. Каменная пачвара пагражае задушыць у сваіх халодных абдымках. Кашмар на вуліцы Вязьняў. Чаму яна не дае мне спакою? Для жыхара сучаснае Еўропы старасьвецкая брама – даўно ўжо музейны экспанат пад адкры-тым небам. Іншая рэч, калі жывеш паводле законаў сярэднявечнага мес-та, дзе ўсе свае і ўсё сваё. Бяз брамы тут не абысьціся. Яна ня толькі візітоўка гораду. Гэта надзейная абарона ад нахабных козаў, якія ну проста пішчом лезуць у твой гарод, каб паласавацца халяўнай капустай. Хай сабе брама не працінае аблокі, высока ўзьлятаючы вострым скляпеньнем, а млява калупае неба. Хай сабе яе атачаюць ня велічныя каменныя муры, а збуцьвелы калгасны паркан. It is not important. Або, па-людзку кажучы, халера з ім, з парканам. Галоўнае што брама ёсьць. Інакш бы суседзі засьмяялі.

Жыцьцё за брамаю зусім не такое гаротнае, як цьвердзяць упартыя скептыкі. Пасадзіўшы бульбу, у вольны час можна сузіраць наваколье праз шчыліны ў паркане. Глядзець, як зіхцяць-пераліваюцца на сонцы дэмакратыі, правы, свабоды ды іншыя бліскучыя еўрапейскія цацкі. Звабленыя іхным бляскам, некаторыя спрытнюгі прымудраюцца праплішчыцца між дошак, каб даць лататы. Іншыя імкнуцца прабіць браму ўласнай галавою, каб у выпадку посьпеху ламануцца ўсім разам. Шчырае імкненьне перарасло ў своеасаблівы спорт, дзе лік вядзецца згодна з колькасьцю набітых гузакоў. Часам спаборніцтва набывае выгляд ка-манднай гульні. Галоўны супернік зборнай брамабойцаў – каманда гарадзкой варты. Апошняя даўно займела чэмпіёнскі тытул.

Але бальшыня міралюбных месьцічаў не адчувае браку гузакоў. У іх ёсьць свой улюбёны від спорту – чаканьне. Яно вымагае, бадай, большых высілкаў, чымся марафонскі забег. Хто каго пераждыве-перачакае: мы іх або яны нас...

Гатуеш сьняданак і чакаеш, капаеш бульбу й чакаеш, глядзіш навіны й чакаеш, крычыш нямым голасам ад безвыходнасьці, калі ўсё, здаецца, навек страчанае, і... усё адно чакаеш. Мо раптам паваліцца глухі паркан. (Будзе горш, калі з воклічам «Хорошо! Мать твою так!» яго пратараніць п’яны трактарыст з суседняга калгасу).

Раз-пораз аблічча прасьвятляецца спадзевам. Уздых. Ізноў чаканьне, чаканьне, чаканьне...

– Так жыць нельга!

– Льга... льга... льга... – сьмяецца рэха.

Нябёсы маўчаць. Маўчыць Тупая Брама. Аблезлы певень узьлятае на паркан і дзярэ горла што ёсьць моцы. Яму гаварыць дазволена.

«Не бядуй, хлопча, – чыясьці рука кранае маё плячо, – Ты яшчэ малады. Пачакай. А брама... Ды хай сабе стаіць. З ёй неяк спакайней».

Я маўчу. У жыцьці кожнага чалавека ёсьць свая брама. У адных яна Вострая, у другіх – Тупая, а ў трэціх – хакейная. Кожнаму сваё.